**З.М. ЗАІКА**
Рэспубліка Беларусь, Брэст, УА «БрДУ ім. А.С. Пушкіна»

## СЛОВАЎТВАРАЛЬНЫ ПАТЭНЦЫЯЛ ФАРМАНТАЎ КАТАЙКОНІМАЎ У ЗАХОДНЕПАЛЕСКІХ ГАВОРКАХ БРЭСТЧЫНЫ

У самой сістэме мовы закладзены неабходныя ўмовы для неабмежаванай патэнцыяльнасці і абсалютнай прадуктыўнасці катайконімаў (назваў жыхароў па месцы пражывання), аднак на практыцы яны не заўсёды рэалізуюцца.

Асаблівасці фонамарфемнай структуры айконімаў уплываюць на валентныя магчымасці суфіксаў катайконімаў у дэрывацыйным адтапанімным працэсе. Існуе пэўная залежнасць паміж фонамарфемнай структурай айконіма і фанемнай структурай словаўтваральнага фарманта катайконіма. Гэта адна з дамінуючых умоў адтапанімнага (як і апелятыўнага) словаўтварэння: дэрывацыйны акт не можа адбыцца, калі на стыку морфаў апынуліся фанематычна несумяшчальныя гукі, таму, калі ўзнікаюць камбінатарныя цяжкасці, пачынаюць дзейнічаць законы марфатактыкі (усячэнне асновы, ускладненыя словаўтвараьныя суфіксы, выпадзенне галосных, асіміляцыя, нарашчэнне асновы, накладанне морфаў і іншыя).

Аналіз фактычнага матэрыялу паказвае, што адсутнасць катайконімаў ад значнай колькасці айконімаў не заўсёды тлумачыцца структурай тапонімаў, таму што іх фанамарфемная будова дазваляе свабодна спалучацца з суфіксамі катайконімаў *-ец, -анін, -чанін, -ук(-чук)* і інш. Гэта айконімы тыпу: *Дуброўка, Барок, Баранкі, Камянюкі, Бяроза, Камароўшчына* і інш. Дзейнічаюць тут у першую чаргу знешнія (сацыяльныя) прычыны. Найчасцей гэта датычыцца новых назваў або назваў невялікіх населеных пунктаў (хутароў, сёлаў, пасёлкаў), якія ў адміністратыўна-гаспадарчым або культурным жыцці раёна, вобласці адыгрываюць нязначную або малапрыкметную ролю. Перашкаджае іх ужыванню старажытная традыцыя ўказваць на паходжанне людзей аналітычнымі варыянтамі ў форме субстантываваных адтапанімных прыметнікаў або субстантыва з прыназоў-

нікамі, напрыклад: *дуброўскі, кобрынскі, баранкаўскі* (чалавек); *з Дуброўкі, з Кобрына, з Баранак.*

Той факт, што ад пэўнай часткі айконімаў вытворныя не ўтвараюцца па лінгва-сацыяльных прычынах, не дае падстаў для абмежавання патэнцыяльнасці і прадуктыўнасці ўтварэння катайконімаў, паколькі яны, як любая іншая заканамернасць, з'яўляюцца адноснымі і не прадугледжваюць дэрыватаў у абавязковым парадку ад усіх без выключэння тапонімаў.

Аднак неабмежаваная патэнцыяльнасць, цесна звязаная з моўнай дзейнасцю, нярэдка супярэчыць сістэме моўных нормаў і далёка не заўсёды адпавядае іх патрабаванням (аналагам). Гэтая неадпаведнасць выяўляецца ў тым, што ўтвораныя пэўным індывідуумам адтапанімныя дэрываты адрозніваюцца той ці іншай асаблівасцю ад існуючых мясцовых формаў або не адпавядаюць заканамернасцям літаратурнага адтапанімнага словаўтварэння.

Вынікам супярэчнасцяў паміж неабмежаванай патэнцыяльнасцю адтапанімных суфіксаў і сістэмай моўных нормаў з'яўляецца словаўтваральнае вар'іраванне, якое на сучасным этапе, па сутнасці, засмечвае словаўтваральныя і словаўжывальныя нормы адтапанімных вытворных. Напрыклад: *в. Вусімле – вýсімэц, вусцімэ́лец, вусцімля́нін, вусцімляніца; в. Вугалец – вугальча́нін, угальча́нец, гольча́нін, угольча́к.*

Супярэчнасці знікаюць, калі новатвор па змесце і форме супадае з усталяваўшыміся функцыянуючымі мадэлямі. Так, для арэала заходнепалескіх гаворак Брэстчыны самым распаўсюджаным для ўтварэння катайконімаў мужчынскага роду з'яўляецца суфікс *-ец*, які аказаўся самым устойлівым у часе. Варыянтныя суфіксы толькі часткова закранулі сферу функцыянавання катайконімаў з суфіксам *-ец*. У апошні час намецілася выразная тэндэнцыя да актуалізацыі катайканімічных утварэнняў з *-ец*, пераход іх з нелітаратурнай сферы ў літаратурную.

Словаўтваральны тып з суфіксам *-ец* і яго вытворнымі (*-анец, -янец, -інец, -овец, -енец)* – самы прадуктыўны. Ён распаўсюджаны на ўсёй тэрыторыі Заходняга Палесся. Пры дапамозе гэтага суфікса катайконімы ўтвараюцца ад розных тыпаў айконімаў: *Ліпава – ліпавец, Бухлічы – бухліча́нец, Козішча – козішча́нец, Стасюкі – стасюкóвец.* Адной з адметных з'яў у вуснай мове карэннага насельніцтва з'яўляецца націскны фармант *-ец*: *Бялёва – бэлювэц, Пінькавічы – пінькавец.* Практычна выкарыстанне кожнага тапоніма і яго вытворных абмежавана пэўнай тэрыторыяй, якая і з'яўляецца сферай яго функцыянавання. Найчасцей сустракаюцца вузкія сферы распаўсюджання: напрыклад, катайконім *варанёвец – ад в. Варані* Столінскага раёна жыве толькі ў маўленні жыхароў адной вёскі Варані. Існуе значная колькасць адтапанімных вытворных, распаўсюджаных па ўсёй тэрыторыі Заходняга Палесся Берасцейшчыны, што зафіксаваны з даўніх ча-

соў. Яны жывуць у моўнай памяці, іх ведаюць і пры неабходнасці носьбіты мовы карыстаюцца імі як адзінкамі, ўжо гатовымі да ўжывання. Звычайна гэта вытворныя ад назваў гарадоў і раённых цэнтраў, вялікіх вёсак: *пінчанін, пінчук, столінец, столінцы, камянча́не, берасцеец, берасцейцы.* Такія формы рэгулярна ўжываюцца ў мове і з'яўляюцца прывычнымі.

Нелітаратурныя адтапанімныя дэрываты ў свой склад уключаюць дыялектныя і міждыялектныя з'явы. У арэале заходнепалескіх гаворак Брэстчыны найбольш цікавымі ў этнічным плане з'яўляюцца катайконімы мужчынскага роду з маскулінным суфіксам *-іц (-ыц, -аніц)*. У сучаснай беларускай літаратурнай мове гэты тып мае выключна фемінные значэнне.

Вытворныя з суфіксам *-іц(а), -ніц(а), -аніц(а)* пераважна ўтвараюцца ад: а) асноў айконімаў ж.р. на цвёрды ці зацвярдзелы зычны: *Плотніца – плотнічаніца, Глінка – гліняніца;* б) асноў айконімаў м.р. на мяккі і цвёрды зычны: *в. Моталь – мотоляныца, Опаль – ополяныца;* в) ад розных тыпаў айконімаў ніякага роду: *Хомічава – хомічаныца;* г) ад асноў айконімаў множнага ліку на *-ічы/-ычы, -іцы/-ыцы, -ішчы/-ышчы: в. Бухлічы – бухлічаніца, Дворышчы – дворышчаніца.*

Пры гэтым для вырашэння валентных магчымасцей пачынаюць дзейнічаць законы марфатактыкі. Напрыклад: 1) калі ўтваральная аснова заканчваецца на *цк*, суфікс далучаецца да поўнай асновы, аднак пры гэтым адбываецца рэгрэсіўная асіміляцыя *ц-к* і адначасовае чаргаванне *ц/ч*: *Сіціцк – сітычаніца, Вартыцк – вартычаніца;* 2) калі аснова айконіма заканчваецца фіналлю *ка*, адбываецца яе ўсячэнне: *Глінка – гліняныца;* 3) пры далучэнні суфікса да асновы на заднеязычны на стыку морфаў адбываецца чаргаване *г/ж, х/ш, к/ч: Струга – стружаныца, Гарбаха – гарбашаніца;* 4) усякаецца фінальная частка айконімаў *-ава: Хомічава – хомічаніца;* 5) на стыку губных можа ўзнікнуць устаўны *-л-*, калі суфікс далучаецца да ўсечанай асновы айконімаў на *-ічы/-ычы: Панцэвічы – панцэуляныца.*

Націск у пераважнай большасці вытворных падае на перадапошні склад: *Рухча – рухчаныца, Струга – стружаныца.* Гэты тып сканцэнтраваны пераважна ў межах Столінскага, Пінскага, Іванаўскага, Драгічынскага раёнаў; даволі распаўсюджаны тып катайконімаў мужчынскага роду з суфіксам *-ан (-ян): в. Галец – гальчан, в. Забалацце – забалацян, в. Залужжа – залужан;* звяртае ўвагу шырокаўжывальны тып катайконімаў з суфіксам негатыўнай ацэнкі *-ок(-ак), -уч(а), -чук: в. Ляхі – ляшок, ляхуча* і эмацыянальна нейтральнымі суфіксамі *-ук(-юк), -ік(-ык), -ух, -ач: Камянец – камянчук, Пінск – пінчук, Замшаны – замшач, Жабы – жабух;* сустракаецца яшчэ адзін тып адтапанімных вытворных, які ўтварыўся ад былых тапонімаў, напрыклад: *лапец, лапцы, лапчанка* ад былой назвы *в. Лапцы,*

цяпер *в. Вікаравічы*, або *мостовец, мостовцы* ад былой назвы *Каралёў Мост*, цяпер *Камянюкі*.

Працэсы распаўсюджвання сферы выкарыстання адтапанімных дэрыватаў, актуалізацыя іх, пашырэнне магчымасцей словаўтварэння адбываецца спантанна, пад уплывам разнастайных этнагенетычных працэсаў, моўных кантактаў. Разам з тым на сучасным этапе развіцця культуры павышаецца і культура мовы, уніфікуецца адтапанімнае словаўтварэнне, памяншаецца колькасць словаўтваральных варыянтаў, упарадкоўваецца іх словаўтварэнне, знікаюць ненарматыўныя ўтварэнні.